НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# МАТЭРЫЯЛЫ ПА АРХЕАЛОГІІ БЕЛАРУСІ

# MATERIALS ON THE ARCHAEOLOGY OF BELARUS

Зборнік навуковых артыкулаў
Заснаваны ў 1957 годзе

**Выпуск 21**

## Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка)

## The Study of archaeological sites on the territory of Polotsk Land (to the 1150$^{th}$ anniversary of Polotsk)

Мінск
«Беларуская навука»
2011

УДК 902/904(476.5)(082)

У выданні прадстаўлены асноўныя вынікі навуковых даследаванняў археалагічных помнікаў ў межах г. Полацка і тэрыторыі Полацкай зямлі. Помнікі вывучаліся навуковымі супрацоўнікамі і аспірантамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі, супрацоўнікамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. У зборнік таксама увайшлі публікацыі аб старажытных паселішчах, могільніках і асобных катэгорыях знаходак з тэрыторыі Полацкай зямлі, якія раней не былі уведзены ў навуковы зваротак.

Р э д а к ц ы й н а я  к а л е г і я:

В. М. Ляўко, доктар гістарычных навук, прафесар (галоўны рэдактар);
П. Ф. Лысенка, доктар гістарычных навук, прафесар
(намеснік галоўнага рэдактара);
Г. В. Штыхаў, доктар гістарычных навук, прафесар;
А. Г. Калечыц, доктар гістарычных навук, прафесар;
Э. М. Загарульскі, доктар гістарычных навук, прафесар;
С. Я. Рассадзін, доктар гістарычных навук, прафесар;
І. А. Марзалюк, доктар гістарычных навук, прафесар;
С. А. Піваварчык, доктар гістарычных навук, дацэнт;
А. М. Мядзведзеў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (адказны сакратар);
В. Л. Лакіза, кандыдат гістарычных навук (намеснік адказнага сакратара)

Н а в у к о в ы  р э д а к т а р,  у к л а д а л ь н і к

доктар гістарычных навук, прафесар В. М. Ляўко

Р э ц э н з е н т ы:

доктар гістарычных навук, прафесар І. А. Марзалюк,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. М. Мядзведзеў

*Выданне падрыхтавана ў рамках выканання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня 2007 г. № 647 «Аб зацвярджэнні Комплекснай праграмы развіцця г. Полацка на 2008–2012 гады», п. 23 «Арганізацыя працы пастаяннай археалагічнай экспедыцыі па вывучэнні Полацкай зямлі» (кіраўнік экспедыцыі – доктар гістарычных навук, прафесар В. М. Ляўко).*

На вокладцы змешчана выява знаходкі з Полацка
(даследчык Д. У. Дук)

**ISBN 978-985-08-1366-4**

© ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2011
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2011

# ЗМЕСТ

**Прадмова** .......... 4

## АРТЫКУЛЫ

**Джумантаева Т. А.** Музеефікацыя гісторыка-культурных помнікаў як частка працэсу адраджэння і захавання спадчыны .......... 5

**Саливон И. И., Емельянчик О. А.** Формирование антропологического состава населения Полоцкой земли в XI–XIX вв. .......... 19

**Дук Д. У.** Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. .......... 30

**Дук Д. У., Емяльянчык В. А.** Могілкі полацкага гарадзішча (па выніках археалагічных раскопак ў 2007 г.) .......... 61

**Клімаў М. В.** Новыя даныя аб Запалоцкім пасадзе ў Полацку (па выніках раскопак ў 2008 г.) .......... 74

**Дук Д. У.** Экімань ў сацыятапаграфічнай структуры Полацка XV–XVIII стст. .......... 99

**Магалінскі І. У.** Вытворчыя ювелірныя комплексы старажытнага Полацка (X–XVII стст.) .......... 115

**Левко О. Н., Войтехович А. В., Кенько П. М.** Археологические исследования Друцка в 2008–2009 гг. .......... 122

**Левко О. Н.** Витебск на пути «из варяг в греки» .......... 154

**Чараўко В. У.** Да пытання аб раскопках М. Ф. Кусцінскім познесярэдневяковых курганных пахаванняў ў Лепельскім павеце .......... 160

**Штыхаў Г. В.** Старажытны Лагойск у святле археалагічных раскопак .......... 163

## МАТЭРЫЯЛЫ

**Магалінскі І. У.** Ліцейныя формы і тыглі для плаўкі каляровых металаў з тэрыторыі Полацка (X–XVII стст.) .......... 184

**Клімаў М. В., Кенько П. М.** Элементы паяснога набору з г. Полацка (па выніках раскопак 2008–2009 гг.) .......... 194

**Емяльянчык В. А.** Комплексная антрапалагічная характарыстыка матэрыялаў пахаванняў XVII–XVIII стст. на полацкім гарадзішчы .......... 199

**Ляшкевич Э. А.** О находках рыболовного инвентаря в средневековых могильниках Беларуси .......... 204

**Разлуцкая А. А.** Новыя даныя аб ахвярных жывёлах з курганоў Полацкай зямлі .......... 212

**Салаўёў А. А.** Новыя знаходкі сюжэтных кафляў у Полацку .......... 220

**Мядзведзева В. У.** Культура сярэдневяковага насельніцтва Полацка (на аснове касцярэзнай вытворчасці) .......... 225

**Шарковская Н. Ю.** Находки с Замковой горы в собраниях витебских музеев .......... 232

**Ермохин М. В.** Результаты дендрохронологических исследований археологических материалов с территории Витебска в 2009–2011 гг. .......... 265

**Ермохин М. В.** К вопросу о датировке «россонского идола» .......... 270

***В. У. Чараўко,*** *Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, выкладчык кафедры айчыннай і усеагульнай гісторыі (г. Навaполацк)*

# Да пытання аб раскопках М. Ф. Кусцінскім познесярэдневяковых курганных пахаванняў у Лепельскім павеце

Курганныя пахаванні з'яўляюцца адносна нешматлікай катэгорыяй пахавальных помнікаў позняга сярэдневякоўя і ранняга новага часу (XIV–XVIII стст.). Дамінуючы від пахавальнага збудавання з VIII–IX стст. – курганы – паступова выцясняюцца грунтавымі магіламі пасля прыняцця хрысціянства. З XII ст. звычай насыпаць над пахаваннямі курганы пачаў знікаць, а ў XIII ст. курганныя пахаванні саступілі месца грунтавым. У горадзе, дзе хрысціянізацыя адбывалася хутчэй, пераход ад курганных пахаванняў да грунтавых магіл адбыўся ў XI ст. [2, с. 491–492; 3, с. 178]. Тым не менш як рэліктавая з'ява курганны абрад пахавання працягваў існаваць і ў эпоху позняга сярэдневякоўя і ранняга новага часу [1, с. 124–125].

Пры звычайнай для пахаванняў гэтага часу безынвентарнасці шэраг курганных пахаванняў надзейна датуецца на падставе знаходак манет. Паводле сучаснай айчыннай літаратуры [1], на Беларусі вядома не менш сямі знаходак манет у позьнесярэдневяковых курганах. Тры знаходкі адносяцца да тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Гэта курган каля былога маёнтка Забалоцце на беразе возера Доўгае ў Лепельскім павеце, курганнае пахаванне каля в. Крывец таксама ў Лепельскім павеце і курган каля в. Кузьмаўшчына на Браслаўшчыне. Раскопкі курганных пахаванняў у першых двух выпадках праводзіў М. Ф. Кусцінскі. Ва ўсіх выпадках манеты адносяцца да XVI ст. [1, с. 125].

Міхаіл Францавіч Кусцінскі (1829–1905) адносіцца да ліку археолагаў-аматараў, адыграўшых важную ролю ў станаўленні айчыннай археалагічнай навукі. Ён першы на Беларусі пачаў выкарыстоўваць метад фотафіксацыі [4, с. 359]. Згаданыя раскопкі лепельскіх курганоў – адны з першых у поўным сэнсе гэтага слова археалагічных раскопак пахавальных помнікаў позняга сярэдневякоўя і ранняга новага часу. Аб двух выпадках выяўлення М. Ф. Кусцінскім у курганных пахаваннях манет XVI ст. мы ведаем з двух крыніц: кнігі археолага-аматара і краязнаўца А. М. Семянтоўскага «Беларускія старажытнасці» [6] і артыкула М. Ф. Кусцінскага «З нататак аб курганах Лепельскага павета» [5]. Параўнаем звесткі аб гэтых раскопках:

| Паведамленне А. М. Семянтоўскага аб раскопках М. Ф. Кусцінскага | Паведамленне М. Ф. Кусцінскага аб уласных раскопках |
|---|---|
| «…каля вёскі і возера Крывец, я выявіў адну дзіўную рэч, якую не магу ўразумець. Справа ў наступным: курганы ў ліку дванаццаці ляжаць на плоскім узвышшы, побач з імі знаходзяцца старыя закінутыя могілкі хрысціянскія, на якіх у цяперашні час не хаваюць і нават няма ні аднаго крыжа на іх, а толькі бачныя невялікія магільныя насыпы, абкладзеныя камянямі, як гэта робіцца і зараз. Раскапаўшы адзін з найблізкіх да старых могілак курганаў, я знайшоў жаночы касцяк, на ілбу якога ляжала сярэбраная манета, гэтак званы патрыгрошны грош літоўскі Жыгімонта Аўгуста 1569 года, на нябожчыцы быў скураны пояс, упрыгожаны шпількамі (?), цалкам такімі, як цяперашнія. У іншым кургане знойдзены жалезны трохграневы напільнік і абломкі крэменю. Адным словам, усе рэчы даказвалі, што курганы адносяцца да XVI стагоддзя; значыць за 300 гадоў выконваўся яшчэ месцамі паганскі пахавальны абрад, г. зн. што нябожчыка клалі на зямлі і над ім сыпалі курган». | «Пераходжу, нарэшце, да пытання: ці доўгі час захаваўся паганскі абрад пахавання ў курганах, каб не закапваючы у вырытай у зямлі магіле, пакласці нябожчыка на паверхні зямлі і насыпаць над ім больш або менш высокі курган. Што гэты абрад доўга захоўваўся ў Лепельскім павеце, магу даказаць наступным фактам. У 1879 г. я раскопваў курганы на зямлі маёнтка Забалоцце Пышнянскай воласці, над возерам, што завецца Доўгае. Курганоў было каля 10, размешчаных у адну прамую лінію. Апошні курган прылягаў да старых хрысціянскіх могілак, на якіх ужо з даўніх часоў нікога не хаваюць, так што нават усе крыжы згнілі і паваліліся. Заўважны толькі малыя магільныя насыпы доўгай формы, абнесеныя невялікімі камянямі. Раскапаны былі 2 кургана, бліжэйшыя да могілак; у адным пахавана жанчына, на ёй быў скураны пояс, напаўспарахнелы, з меднымі шпількамі з галоўкамі, падобнымі на цяперашнія, даўжынёй у 1 вяршок: іх было штук каля 40; на руках 2 пярсцёнкі. Выраб медных шпілей ніяк не раней XV або XVI ст. У другім, бліжэйшым да могілак, быў мужчынскі шкілет; каля яго ляжалі абломкі крэменю і стальны трохгранны напільнік, які служыў, верагодна, як крэсіва; на лобнай костцы чэрапа пакладзена сярэбраная манета, – гэта літоўскі паўгрош Жыгімонта Аўгуста 1562 г.; на лобнай костцы, на якой ляжала манета, застаўся зялёны вокіс метала. Чаму пакладзена манета, растлумачыць не магу; у любым выпадку яскравы доказ таго, што ў Лепельскім павеце і ў XVI ст. існаваў абрад язычніцкага пахавання». |




Карта Лепельскага раёна (фрагмент)

Такім чынам, А. М. Семянтоўскі паведамляе аб раскопках М. Ф. Кусцінскага, спасылаючыся на яго ліст ад 16 сакавіка 1885 г. Нягледзячы на адсутнасць двухкосся, тэкст падаецца ад першай асобы («я выявіў», «я знайшоў») [6, с. 27–28]. Гэта ўказвае на тое, што ліст М. Ф. Кусцінскага цытуецца А. М. Семянтоўскім дакладна і літаральна. Паводле гэтага паведамлення, у Пышнянскай валасці, на адлегласці прыкладна ў 15 вёрст ад Лепеля, каля вёскі і возера Крывец, М. Ф. Кусцінскі выявіў 12 курганоў побач са старымі закінутымі хрысціянскімі могілкамі. Крыжоў на хрысціянскіх могілках не захавалася, невялікія магільныя насыпы абкладзены камянямі. Раскопкі двух бліжэйшых да старых могілак курганоў выявілі ў адным жаночы шкілет з сярэбраным патрыгрошным грошам Жыгімонта Аўгуста 1569 г. на лобнай костцы. На касцяку захаваўся скураны пояс, упрыгожаны шпількамі («булавками»), «гэткімі ж, як і цяперашнія». У другім кургане быў знойдзены жалезны трохгранны напільнік і кавалкі крэменю [6, с. 27–28].

Аб другім выпадку знаходжання манеты ў познесярэдневяковым курганным пахаванні піша сам М. Ф. Кусцінскі. У адпаведнасці з гэтым паведамленнем, у 1879 г. археолаг праводзіў раскопкі курганоў над возерам Доўгае, на зямлі, якая адносілася да маёнтка Забалоцце Пышнянскай валасці. Курганоў было каля 10. Яны размяшчаліся ў адну лінію. Апошні курган прымыкаў да старых хрысціянскіх могілак, на якіх даўно не хавалі. Усе крыжы згнілі. Былі заўважаны малыя насыпы, абкладзеныя невялікімі камянямі. У ходзе раскопак двух бліжэйшых да могілак курганоў у адным быў знойдзены жаночы, а ў другім – мужчынскі касцяк. На жанчыне быў скураны пояс, упрыгожаны прыблізна сарака меднымі шпількамі («булавками») з галоўкамі накшталт сучасных. Каля мужчынскага шкілета ляжалі кавалкі крэменю і стальны трохгранны напільнік, відаць, крэсіва. На лобнай костцы чэрапа ляжала сярэбраная манета – паўгрош Жыгімонта Аўгуста 1562 г. [5, с. 235].

Апісанні гэтых курганных пахаванняў настолькі падобныя, што ўзнікае пытанне, ці не ідзе

размова аб адным і тым жа даследаваным аб'екце [7, с. 272–273]. Канечне, адрозніваецца намінал і дата манеты, яе прыналежнасць да жаночага або мужчынскага пахавання, назва возера, каля якога праводзіліся раскопкі. З іншага боку, супадае мясцовасць, від пахавальнага збудавання, асаблівасці курганнага магільніка і яго размяшчэння, колькасць даследаваных курганоў, пол пахаваных, факт наяўнасці манеты на лобнай костцы, іншыя знаходкі. У абодвух выпадках курганны абрад пахавання звязваецца з перажыткамі паганства.

Звернемся да карты Генеральнага штаба СССР 1936 г. маштабам 1 : 50 000 (малюнак). На ёй пазначана возера Доўгае, на беразе якога знаходзіцца вёска Крыўцы, а непадалёк – Забалоцце. Такім чынам, карта сведчыць аб тым, што вёска Крывец (Крыўцы) і возера Доўгае знаходзяцца побач. Гэта пацвярджае меркаванне аб тым, што А. М. Семянтоўскі і М. Ф. Кусцінскі апісваюць адзін і той жа даследаваны аб'ект.

Параўнаўчы аналіз паведамленняў А. М. Семянтоўскага і М. Ф. Кусцінскага аб раскопках апошніх курганоў XVI ст. у Лепельскім павеце сведчыць аб тым, што яны апісваюць адны і тыя ж раскопкі. Нягледзячы на пэўныя разыходжанні ў апісаннях, падобныя моманты ў апісаннях, дастатковая рэдкасць выяўлення курганнага пахавання XVI ст. з манетай і той факт, што ў абодвух выпадках апісваюцца толькі адны раскопкі без згадвання другіх, сведчаць аб тым, што М. Ф. Кусцінскім у Лепельскім павеце даследаваліся адны курганныя могілкі з манетай XVI ст. Што датычыцца разыходжанняў у паведамленнях, яны могуць тлумачыцца працяглым перыядам (24 гады) паміж правядзеннем раскопак і ажыццяўленнем публікацыі. Цалкам магчыма, што некаторыя дэталі раскопак 73-гадовы даследчык узгадаў недакладна.

З іншага боку, нельга выключаць, што якраз публікацыя самога М. Ф. Кусцінскага найбольш дакладная. Напрыклад, толькі ў ёй падаюцца звесткі аб наяўнасці ў жаночым пахаванні пярсцёнкаў.

У любым выпадку, даследаванае М. Ф. Кусцінскім курганнае пахаванне датуецца паводле манеты 1560-мі гадамі. Параўнаўчы аналіз паведамленняў А. М. Семянтоўскага і М. Ф. Кусцінскага прыводзіць да высновы, што размова ідзе аб раскопках на адным і тым жа аб'екце. Такім чынам, агульная колькасць вядомых курганных пахаванняў позняга сярэднявечча і ранняга новага часу з манетамі – не сем, а шэсць, у тым ліку не тры, а два такіх помніка знаходзяцца на тэрыторыі Беларускага Падзвіння.

### Літаратура

1. Археалогія Беларусі: у 4 т. – Мінск: Беларус. навука, 1998–2001. – Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.]; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. – 2001. – 597 с.: іл.
2. Багамольнікаў, У. Пахавальны абрад / У. Багамольнікаў, Я. Рыер // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 5: М – Пуд / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд. [і інш.]). – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 450–451.
3. Вайцяховіч, А. В. Пахавальны абрад / А. В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі: энцыкл.: у 4 т. – Т. 2: Л – Я / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2011. – С. 177–178.
4. Каробушкіна, Т. М. Кусцінскі Міхаіл Францавіч / Т. М. Каробушкіна, Г. А. Каханоўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 359.
5. Кусцинский, М. Ф. Из заметок о курганах Лепельского уезда / М. Ф. Кусцинский // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1903. – № 7. – С. 232–235.
6. Сементовский, А. М. Белорусские древности / А. М. Сементовский. Вып. 1. – СПб.: [Б.и.], 1890. – 136 с.: ил.
7. Чараўко, В. У. Вывучэнне пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. у дарэвалюцыйны перыяд / В. У. Чараўко // ГАЗ. – 2010. – № 25. – С. 271–275.

### Резюме

*В. В. Черевко*

**К вопросу о раскопках М. Ф. Кусцинским позднесредневековых курганных погребений в Лепельском уезде**

Позднесредневековые курганные погребения с монетами – довольно редкое для Белорусского Подвинья явление. В специальной литературе сообщается о том, что известный археолог XIX в. М. Ф. Кусцинский во время археологических раскопок на территории Лепельского уезда дважды выявлял и исследовал подобные погребения.

Источником информации в одном случае служит статья самого М. Ф. Кусцинского, во втором – сообщение о его раскопках археологом и краеведом А. М. Сементовским (со ссылкой на письмо Кусцинского). Однако анализ приводимых М. Ф. Кусцинским и А. М. Сементовским сведений дает основание утверждать, что речь, на самом деле, идет об одних и тех же раскопках.

### Summary

*V. Charauko*

**To the question of excavations of the late medieval burials in Lepel district made by M. Kunstinski**

Late medieval barrows with coins are an extremely rare phenomenon at Belarusian Podvinie. In specialized literature it is reported that the famous archaeologist of the XIX century M. Kustinski elicited and investigated barrows of this kind twice during the archeological excavations in Lepel district.

The source of information in the first case is the article written by M. Kustinski, and in the second case – the report about Kustinski's excavations made by archaeologist and local historian A. Sementovski (with reference to the Kustinski's letter). Hovewer, the analysis of the information provided by M. Kustinski and A. Sementovski allows us to assert that we are actually talking about one and the same excavations.

*Паступіў 29.04.2011*